Сяргей Рублеўскі



...я зразумеў: у чарговы раз у жыцьці
ўзыходжу на той самы круг.
І будучыня мая вяртаецца ў мінулае...

# Жыцьцё-бляшанка

***Аповеды***

## *ЗМУШЭНЬНЈ ПУАНСЭТА*

Адзін пранікнёны літаратуразнаўца сказаў неяк пра мяне ў кампаніі піткоў піва: “Ня ведаю, які ён чалавек, а літаратар дык адметны, так у нас ніхто ня піша”. А быў там і мой стрыечны брат Артур, які і пераказаў гэтыя словы. Прычым Артур ня меў і каліва сумневу ў тым, што мяне вельмі ўсьцешыць такая адзнака. А я задумаўся і нават сумеўся, ня стаў патураць свайму самалюбству. Чаго варты тыя пярліны прыгожага пісьменства, калі на другой шалі вагаў — драбок падазрэньня, адчужанасьці, маўляў, хто ведае, чаго чакаць ад гэтага чалавека, што ў яго на душы...

Мяне гэта вельмі ўстурбавала і прыгняло. Калі я так пераканаўча адлюстроўваюся як літаратар і зусім

цьмяна як чалавек, дык можа не пісаць варта, а чытаць, і найперш Кнігу Кніг, хадзіць у царкву, граніць на наждаках людскога сумоўя сваю душу, каб выбліснула яна дыяментам і ні ў кога не было сумненьняў у маіх духоўных якасьцях. А найперш – у мяне самога.

Дужа часта дакараю я сябе за змушанасьць у стасунках з людзьмі, балбатлівасьць, залішнюю дакучлівую шчырасьць... Асабліва з сябрамі. Шчыльнюся, як мага, да іх, адчыняю разлогі сэрца і неўпрыкмет пачынаю патрабаваць таго ж ад сваіх супольнікаў. А яны не гатовы да такога яднаньня, не прывучаны... Вось і пачынаецца разлад, крыўдлівасьць агортвае. Душа трапечацца, як птушка, у сілку незаменнай повязі.

Адным разам я нават вырашыў не сябраваць больш ні з кім, каб суняць гэты верад. Дарэчы, менавіта тады і ўзяўся за новыя творы. А каб ня быць ужо зусім адзінокім у сьвеце, вырашыў завесьці сябра-кветку — мне параілі знаёмцы купіць адну такую ў магазіне, які адчынілі нядаўна на рагу вуліцаў якраз непадалёк ад майго дому.

Прадавачкай працавала там Леакадзія, мая даўняя сяброўка, якая жыла па-суседску. Па апісаньні яна тут жа сьцяміла, якая кветка мне патрэбная, падвяла да паліцы і торкнула пальцам. Гэта была нічым не прыкметная купка зялёных лісьцінак, даволі доўжанькіх і вастрадзюбых. За што любіць такую расьліну? Хіба за надзею, бо знаёмцы расказалі, што яна вельмі прыемна квітнее, прытым штогод, ды яшчэ на Хрыстова Раство. Я даверыўся іх расповядам.

Дома найперш расчысьціў падваконьне, каб нішто не замінала Пуансэту – менавіта так я назваў свайго новага маўклівага сябра. І цяпер штораніцы найперш падыходзіў да акна і здароўкаўся з зялёным навасёлам, пры гэтым пяшчотна паціскаў пальцамі адну з лісьцінак.

І пасьля таго, як памыюся сам, вяртаўся да Пуансэта, расчыняў вакно і абдаваў кветку вадзяным пылком са сьпецыяльна набытай пырскалкі. Гэтую працэдуру пераняў я з аднаго французскага фільма пра гарапашнага самотніка-кілера.

Калі сядаў пісаць, дык зазвычай пераносіў Пунсэта на пісьмовы стол, ставіў яго леваруч, побач са старадаўнім керамічным ільвом. Тады справа ішла куды спарней. Калі я вагаўся ў выбары сюжэтнага павароту, адразу зьвяртаўся да Пунсэта, і, здавалася, ён падтрымліваў адзін з варыянтаў ледзь прыкметным трымценьнем лісьцінак. Іншым разам нахіляўся да Пунсэта і чытаў яму новы твор або ўрывак, калі гэта была аповесьць ці раман. Амаль заўсёды сябра крышку ўзьнімаў угору свае лісьцінкі. Адным словам, жылі мы душа ў душу, пакуль не прыйшла ў госьці Леакадзія. Як заўсёды, пілі віно з крэветкамі, забаўляліся, цешыліся, а сярод ночы Леакадзія раптам таўханула мяне ў плячо, раскатурхала. Ёй ня спалася.

– А з кім ты ішоў надоечы па Замкавай? Я з акна ўсё бачыла... Што за краля? Няўжо і такія каракаціцы падабаюцца мужчынам?

– Калега, па справах хадзілі, – схлусіў я.

– Ну-ну... – уздыхнула Леакадзія.

Я прыгарнуў яе да сябе.

– А калега Пуансэт як маецца?

– Нішто сабе. Дапамагае. Разам пішам. Ранічкай павітаешся з ім. Сыпі, назола.

І яны павіталіся. Леакадзія, дакранулася сваімі вытанчанымі пальчыкамі да адной з лісьцінак. Праўда, я не прыкмеціў у гэты момант узьнёслага трымценьня Пуансэта.

Сяброўка ўхваліла маю пырскалку, набор мінеральнага падсілкаваньня, наогул усё, што тычылася догляду расьліны.

– А да квітненьня ты яго пакрысе змушаеш, засноўваеш акрасу Божага Нараджэньня?

– ?!

– Як, хіба я табе не казала, што гэтую расьліну трэба змушаць?.. Ты ж яе ўвесь дзянёк на сьвятле трымаеш? Увесь! А па інструкцыі з позьняй восені яно ўжо абмяжоўваецца. Купі чорны шчыльны пакет і ўзьдзявай яго на гаршчок, каб расьліна штодзень гадзін чатырнаццаць была ў цемры. І так восем тыдняў. Тады на Раство будзе “сьвяточны салют” у кватэры.

– А лёгка дзеля гэтага змушаць, а па сутнасьці прыніжаць сябра?

Леакадзія толькі махнула рукой на гэтыя словы: маўляў, не дакучай сваім дзівацтвам. Мне чамусьці стала крыху сорамна. А калі вяртаўся дахаты пасьля таго, як праводзіў яе, міжволі падышоў да шапіка, купіў колькі пляшак піва ды папрасіў прадавачку саставіць іх у чорны, як смоль, пакет з залатой манаграмай на баку.

І гэтае “золата” пачало калоць мне вочы. Калі я пасьля ранішняга асьвяжэньня вільгацьцю накідваў на галаву Пуансэта чорны “башлык”, здавалася, ён дакорліва папракаў мяне гэтымі залатымі літарамі. Пасьля таго, як пачаў затуляць Пунсэта ад сьвятла, я толькі аднойчы перанёс яго на пісьмовы стол. Ніякага дыялогу, ніякага пяшчотнага трымценьня ў знак згоды і блізка не было.

І мы пачалі жыць паасобку. Я нават позірк адводзіў ад макушкі расьлінкі, якая, па словах Леакадзіі, павінна была заняцца на Раство густым чырвона-бурачковым колерам. Нібы баяўся, што сурочу. Для спадзеву мне дастаткова было і таго, што прыкмеціў: лісьцінкі ўжо крышку страцілі сваю смарагдавую сілу, пабляклі, нібы іх абляпіла шызым прыдарожным пылам. І тады я яшчэ больш старанна, у поўнай адпаведнасьці з інструкцыяй пачаў змушаць Пуансэта, і цалкам адцураўся яго прыхільнасьці. Адно прыкідваў раз за разам, колькі дзён засталося да Божага Нараджэньня.

І гэты дзень настаў! Але душу маю чамусьці не агарнула чаканая радасьць, і мне не заманулася ва ўсеагул царкоўнага хваласьпеўнага сумоўя. Адчэпна прачытаў малітву ў сваім кутку ды пачаў рыхтаваць сьвяточны сьняданак. Потым перадумаў: прыйдзе Леакадзія — тады разам і парупімся. Толькі дастаў з лядоўні грыбы ды зялёную гародніну.

Потым пайшоў у свой кабінецік і перасунуў пісьмовы стол пад люстру, каб тут, у крузе сьвятла, і накрыць яго сьвяточным абрусам. Я заўсёды так рабіў на вялікія сьвяты.

Абрус лёг на цёплыя дашчуркі, як заўсёды, шчыльна і мякка. Вялізныя бухматыя кутасы гарнулі яго долу сваім змушальным цяжарам. Звычайна пасярэдзіне я ставіў гарлачык з сухімі кветкамі, цяпер гэтае месца было прызначанае для Пуансэта.

Я зьняў вазон з падваконьня аберуч, так асьцярожна, як вясковыя бабы

здымаюць з загнету ўгрэты за дзень саганок са стравай. Гарачынёй мне была нязнаная дагэтуль трывога. Асьцярожна паставіў вазон пасярод стала і колькі хвілінаў ня зводзіў з яго вачэй. Золата фірмовага надпісу па-ранейшаму сьвяцілася роўным халодным бляскам, але я ўжо жыў прадчуваньнем зусім іншага сьвятла. Спачатку хацеў дачакацца Леакадзіі, каб удвух затуліцца ў яго, а потым перадумаў і рашуча, хоць і асьцярожна, зьняў з Пуансэта чорны мяшок.

...Сьвятло яго квітнеючай макушкі забруілася ў самае маё затоньне, саграючы душу невыказна пяшчотнай цеплынёй, якая бывае, і то рэдка, толькі падчас прыязнай сяброўскай размовы.

Фацэтны чубок лісьцінак чырванеў гусьценькай бурачковай фарбай, і здавалася, яе мроіва дрыжыць над сталом, як калісьці ў дзяцінстве язычок газавай смаркачкі.

– Пуансэцік, ты хвалюешся ня менш, чым я! – шчасьлівы, зьвярнуўся да свайго сябра. Здавалася, супыні сэрца і ходзікі на сьценцы, дык пачуеш у адказ яго ціхае прамаўленьне. Але мне не хацелася, каб і мог, ацішаць сваё сэрца, сваю радасьць і сьвяточную ўзьнёсласьць.

Леакадзія і на драбок не парушыла гэты настрой – усё было гожа і суладна. Мы пілі віно, раскашаваліся смачнымі стравамі, а любошчы, у адрозьненьне ад ранейшых сустрэчаў, былі толькі прыемным дапаўненьнем паўнаплыннасьці жыцьця. Амаль усе дні сьвяткаваньня Раства мы нікуды не выходзілі – проста не хацелася, і ўвесь гэты час з сярэдзіны стала самааддана сьвяціў нам Пуансэт. І ноччу я яго адчуваў: здавалася, ён дыхае, як нованароджанае кацянятка.

Сьвята скончылася разам з пасьпешлівым сыходам Леакадзіі. Ёй трэба было на працу. Калі каханка сагнулася, каб цмокнуць мяне на разьвітаньне, я ўбачыў у яе руцэ зрэзаную макушку Пуансэта. Вусны мае зьмярцьвелі. Леакадзія імгненна адчула гэта і ўсхліпнула:

– А як мне на сваёй сялібе без сьвятла, без цеплыні жыць, ты падумаў? У гурбе сьцюдзёнага ложка... У павучыньні гнятлівай адзіноты... А макушку гэту я ў слоік з вадой пастаўлю, надтачу сьвята, – Леакадзія ўцёрла вочы ражком хусьцінкі.

– Дарэчы, ты ня думай, што Пуансэт твой доўга квітнеў бы. Якраз і пара зразаць макушку, каб адпачыла расьлінка, а потым зноў змушаць расквітнець роўна праз год. У нас жа будуць яшчэ супольныя сьвяткаваньні, праўда?! – прыхінулася да мяне Леакадзія.

– Будуць... – прамармытаў я паныла ў адказ і праводзіў яе да дзьвярэй.

Зачыніўшы за ёй, ня ведаў, што і рабіць. І найперш з цяжкасьці наладжваньня новых стасункаў з Пуансэтам. Я ўжо баяўся на яго глянуць, абкарнанага, нібы вясковы малец хатняй цырульнай машынкай.

Знайшоў чорны пакет і бокам пасунуўся ў пакой, каб, адвёўшы вочы, зноў затуліць зялёную купіну ў змрочную адчужанасьць. Спачатку заманулася папырскаць на лісьце сьпецыяльна набытай у краме крынічнай пітной вадой, але потым апамятаўся, бо зразумеў, што Пуансэт уважыць гэта за падхалімскую спробу прымірэньня. Шляху назад у мяне ўжо не было, і я вырашыў аднесьці расьліну назад у краму да Леакадзіі. Гэта было падобна на пахаваньне ні то сваёй мары, ні то ампутаванай часткі

свайго цела, а можа, і душы. Аніяк ня мог наважыцца апрануцца і ў маркоце, апанаваны сумнымі думкамі, заваліўся ніцма на канапу.

“Ну вось, ізноў разьвітаньне з чарговым сябрам, і значыць, будзе вяртаньне ва ўчарашні дзень, склейваньне аскепкаў старой дружбы, узыход на свае ж кругі як чарговае пацьвярджэньне душэўнай няпэўнасьці і недасканаласьці. І ўсё ладзіцца міжволі, з непрадказальнай логікай слабасьці...”

Я ўзьняўся з канапы і пайшоў на кухню гатаваць сабе каву. Ня столькі хацелася ўзбадзёрыцца, колькі проста чым-небудзь заняцца, каб трошкі разагнаць гнятлівыя думкі. Але яны доўжыліся і доўжыліся...

“А падумаць, што я ўчыніў з Пуансэтам!.. Калі сашчыльніць час нашай дружбы да імгненьняў, дык атрымліваецца, што ён зьвёўся толькі да аднаго вычварэньня: галаву ў мяшок, раз — і на калодку. Сяброўства-катаваньне, ды яшчэ з удзелам далікатных жаночых ручак...”

Я наліў сабе кавы і запаліў. І тады прыйшла ў галаву думка патэлефанаваць Петрусю, з якім сябраваў гадоў восем, а потым незнарок пакрыўдзіў яго няўдалым жартам-кпінай і вось так надоўга адшыў ад сябе. І патэлефанаваў. Пятрусь прапанаваў сустрэцца і чамусьці зацеміў, што прыйдзе адзін, без Вікторыі. Я ўзяў Пуансэта (крама была па дарозе) і выйшаў на вуліцу. Новы палітон трошкі сьціскаў мне плечы, было мулка, няўтульна ў яго сугрэўнай цеплыні. І наогул – ва ўсім сьвеце.

Яшчэ і таму, што я зразумеў: у чарговы раз у жыцьці ўзыходжу на той самы круг. І будучыня мая вяртаецца ў мінулае, пазначанае невыводнай чалавечай слабасьцю.

## *ЖЫЦЬЦё-БЛяШАНКА*

Я служыў у войску тады яшчэ па-імперску агромністай краіны, населенай плоймай народаў, якія ў абшчэпах інтэрнацыяналізму моцна сябравалі паміж сабой. Але на вайсковай службе шалапутныя сыны мудрых бацькоў зацята варагавалі.

У нашай роце, напрыклад, было два “кланы” – паўднёвікаў і крывічоў. Сваіх саслужыўцаў мы абзывалі “чарнажупікамі”, а яны нас у сваю чаргу – “бульбашамі”.

Ды каб жа абмяжоўваліся мянушкамі. Дзе там. Пухлілі адзін аднаго дзень пры дні. Залучыш употай якога чарнажупіка ў вузкім затулку — і давай мязджуліць. Чаму ж не, калі з табой пара, а то і больш землякоў. Адпаведна і нам выпадала на арэхі. Каб не бацькікамандзіры, пазабіваліся б.

Аднойчы неўтаймоўныя “байцы паўднёвага фронту” зашчапілі і мяне ў капцёрцы. Узялі ў кола і давай мантуліць. Ды так зацята, балюча. Больш за ўсіх стараўся іх завадатар Халад Бюль Самур. А паколькі я, трывушчы бульбаш, аніяк не асядаў долу, разьятраны Халад парушыў няпісаныя правілы міжзямляцкіх калатнечаў і гняную мяне металічнай пушкай для цыгарэтаў. Ды так трапна – у скронь, што я ў адно імгненьне грымнуўся вобзем усімі сваімі косткамі і заліўся крывёю.

Чарнажупікі ўпудзіліся і анямелі. Падумалі: усё, канча мне. Асабліва разгубіўся Халад. Вядома, забаяўся больш пра свой лёс, бо і ўявіць ня мог далейшае жыцьцё ў казарме з закратаванымі вокнамі. Ён увобміг

ачомаўся і найперш па-мусульманску абцёр твар рукамі, укленчыў ды сьпешна папрасіў на сваёй булькатлівай мове ў Алаха і ягонага прарока Мухамеда майго адхланьня. А тады схіліўся нада мной, пачаў, як мог, супыняць кроў, нібы роднаму пасьля доўгай сустрэчы гладзіць твар ды паціскаць мае плечукі.

– Яўкуб, Яўкуб, гэтага больш ніколі ня будзе. Уставай... – жаласьліва скуголіў над вухам упуджаны крыўдзіцель.

Калі я нарэшце расплюшчыў вочы, Халад зарагатаў ад радасьці, як дзіцё, і даў вакол мяне круг свайго дзергатлівага горнага танца. А тады зноў укленчыў, стаў трэсьці маю вялую руку, нібы віншуючы з перамогай, ды ўздымаць з падлогі. Яму пачалі дапамагаць ня менш узрадаваныя землякі-чарнажупікі. Пры гэтым Халад усё лепятаў і лепятаў ім нешта па-свойму, раз-пораз згадваючы Алаха і Мухамеда. Пра маю прыродную трывушчасьць, напэўна, не было там і згадкі.

З таго часу Халад залічыў мяне ў свае шчырыя сябры ды настойліва пачаў запрашаць на госьці — няхай толькі адслужым. І біцца мы сталі куды радзей, усё больш адзін на адзін, а нечаканы дружбак наравіў выставіць супраць мяне сваіх ня надта абайнітых і ня самых дужых землякоў. Бацькі-камандзіры не маглі надзівіцца з гэтых няўцямных, але прыемных пераменаў.

А для нас найпрыемнай навіной у жыцьці, вядома, стаў дэмбель. Нягледзячы ні на што, разьвіталіся мы цёпла, як і не было ранейшай варажнечы ды падзелу на бульбашоў і чарнажупікаў. А Халад нават сказаў мне, што наша дружба павінна быць пажыцьцёвай, бо таямніча зьнітаваная вышэйшай воляй. На разьвітаньне мы абшчапіліся, абмяняліся адрасамі і паабяцалі пісаць адзін аднаму. Праўда, я ў гэта слаба верыў.

А верыў бы яшчэ менш, каб мог прадбачыць, чым завершыцца ператрэсваньне краіны, усчатае напярэдадні нашай вайсковай службы. “Пара пераменаў” выявілася вялікім ператрусам. Колішняя непарушная дружба народаў сплыла, як пульхір па вадзе, і яны адсуседзіліся трывалымі межамі. Мы з Халадам зажылі ў асобных дзяржавах са сваімі шчасьцем і горам. А я, прызнацца, ужо і рэдка ўспамінаў яго – калі-нікалі за чаркай.

І вось – на табе: года праз паўтара прыходзіць ліст ад Халада – з іранічнымі згадкамі пра нашы вайсковыя рабункі, расповядам пра сваю жаніцьбу і яшчэ шмат пра што. Мой “кроўны” прыяцель, аказваецца, ушчаміўся ў нафтавы бізнэс, хоць для гэтага давялося вытрываць колькі боек, у тым ліку і ў першаісным сэнсе, – куды там нашыя пацехі ў вайсковых капцёрках. Затое цяпер – грошы з усіх кішэняў тырчаць.

А яшчэ Халад пахваліўся, што за мяжой у яго знайшоўся прыхільны сваяк Ахмед Куль Мамур, прытым дужа багаты чалавек, маўляў, табе і ня сьнілася. У канцы ліста мой зычлівец сардэчна зваў у госьці і абяцаў наладзіць такі пачастунак, што дамоў давядзецца вяртацца без языка, калі не зрабіць аперацыю ды не дастаць яго са страўніка. Толькі трэба дачакацца яго сустрэчы з Ахмедам, і тады будзе дасланая сьпецыяльная позва. У пастскрыптуме зычлівы Халад зацеміў: багаты замежны сваяк жыве з таго, што ловіць у Касьпіі стогадовых бялугаў... Думай, што хочаш.

Але я ня стаў доўга думаць і пры ўсёй маёй абыякавасьці да эпіста-

лярнага жанру рупненька ўзяўся пісаць адказ. Трэба сказаць, што з цягам часу я, немаведама чаму, згадваў Халада ўсё з большай і большай прыязнасьцю.

Напісаў яму, што пакуль яшчэ не ажаніўся, хоць і маю багаты выбар краляў – а ў нас жа яны найпрыгажэйшыя ў Еўропе – і калі буду брацца шлюбам, дык толькі са сваёй, мясцовай гадоўлі. Напісаў і задумаўся: ці ня ўважыць Халад гэты пасаж за нацыянальную зацятасьць ды згадае маладое вычварэнства бульбашоў. Але махнуў урэшце рэшт рукой: праўда ж (!), і пачаў пісаць далей. Распавёў, што таксама раблю свой бізнес на адборнай бульбе, якую адмысловымі фурамі пастаўляю ў паўночныя рэгіёны сьвету. А яшчэ дзеля славалюбнага выяўленьня і ўмацаваньня роднай мовы прычыніўся да прыгожага пісьменства. Ды на ўсякі выпадак зацеміў, што пішацца мне вельмі лёгка, сюжэты самі лезуць у галаву, не раўнуючы як згадкі пра жанчын, а вось выдаць кніжку надзвычай цяжка. Нават бізнэс не дапамагае, хаджу з шапкай па фундатарах. І гэта было праўдай. На самай справе трылёўкай бульбы на Поўнач займаўся мой стрыечны брат, а я праз свае круцельскія знаёмствы толькі дапамагаў яму абмінуць глухімі дарогамі мытныя заслоны ды кардоны навасьпечаных пасьля развалу вялікай краіны памежнікаў. Схлусіў я Халаду дзеля хварсы, каб не выглядаць перад ім няўдаліцай. А ў завяршэньне ліста выказаў радасьць з яго запрашэньня на госьці: маўляў, як добра будзе тое-сёе ўспомніць з нашай сумеснай службы...

Позва ад Халада прыйшла ў пачатку верасьня. Я хуценька, у тым ліку і праз яго даўгасяжныя знаёмствы, аформіў усе неабходныя ўязныя паперы і ўзяў квіток на самалёт...

Абайніты салдат, а цяпер удалы бізнесовец, сустрэў мяне ў аэрапорце. Ня ведаю, за якія заслугі яму дазволілі падкаціць свой бліскучасты джып ледзьве не да трапу. Як толькі я ступіў на зямлю, Халад борзьдзенька рушыў насустрач.

Добра памажнелы, ён, трымаючы ў правай бутэльку шампанскага, разьвінуў рукі для абдымкаў. Крысоўі сьветлага пінжака таксама расхінуліся ўшыркі: белы іскрысты падбой сьляпуча пераліваўся на сонцы.

– Яўкубе! – засьвяціўся ў прывітальнай усьмешцы Халад і тройчы прытуліўся да маіх шчок калючай шчэцьцю. А потым паставіў бутэльку на зямлю, перахапіў мяне аберуч у крыжавіне і на колькі імгненьняў адарваў ад зямлі. Я шчыра зьдзівіўся такому паўднёваму імпэту.

– А дзе мая і Алахава меціна?! – загагатаў сябрук і ўважліва, але адначасна і чульліва пачаў разглядаць мае скроні. Відаць, і забыў ужо, да якой прылажыўся.

Я крышку зьніякавеў, але Халад тут жа перабіў настрой – гаманліва пачаў адкаркоўваць шампанскае ды напаўняць паднесеныя кіроўцам аўто келіхі.

Па другому келіху мы ўжо выпілі ў джыпе, калі імчалі па дарозе.

– Пром да майго бунгала на ўзьбярэжжы, – прамовіў задаволены Халад.

І мы папёрлі. Мой гасьцінны аднапалчанін безупынку распавядаў пра свае посьпехі і задумы, а я больш слухаў ды зрэдчасу адказваў на пытаньні. І ўсё паглядаў і паглядаў у акно, дзівіўся нязвыклымі краявідамі, якія мяняліся

на вачах. А калі сухавей раз-пораз пачаў шпурляць у машыну жменькі пяску, дык зразумеў, што неўзабаве даедзем, узьбярэжжа ўжо непадалёк.

Халадавым прыпірышчам на моры быў звычайны будан, а не які-небудзь палац на ўсходні манер. Праўда, з адмысловай шырачэзнай верандай, з цудоўным відарысам у вокнах. Тут мы і атабарыліся. Халад паставіў на стол пляшку белага замежнага віна і, па-змоўніцку падміргнуўшы, сказаў:

– А закусваць будзем... О... – і адчыніў высачэзную лядоўню. – Дзівіся! – дастаў ён з палічкі жоўтую шырочанькую бляшанку і пачаў круціць яе ў руцэ. – Ведаеш, што гэта?

Я пацiснуў плячыма.

– Ікра! І ня проста табе ікра, а стогадовай бялугі! Ахмед удружыў. Пастаўляецца толькі да сталоў валадароў сьвету ды на фестывалі аматараў салатаў. Яе ж адна кропля ў моры! Як думаеш, колькі каштуе бляшанка?

– Можа...

– Звыш дваццаці тысячаў зялёных. У асноўным, вядома, ікра, але ж і сама бляшанка не абы-якая. – Халад зноў пакруціў яе ў руцэ. – Прыгледзься да бляску: з чыстага золата. Можна сказаць, золата ў золаце...

Я выявіў сваё шчырае зьдзіўленьне.

– І мы пакаштуем... – Халад прамовіў гэтае выслоўе крыху няпэўна, нібы і сам слаба верыў у маючы адбыцца цуд. Але ўсё ішло да таго.

Сябра дастаў з серванту загадзя падрыхтаваныя вялізныя талеркі. Яны былі ўсланыя шырокімі лісьцінкамі салаты, на якіх ужо былі раскладзены мідыі, гарушкі падсмажаных у адмысловым соусе крэветак, скрылькоў кальмараў.

– А пасярод пакладзём самае галоўнае, – Халад лоўка ўзарваў на стале вечка бляшанкі, нібыта гэта былі звычайныя сардзіны, і паклаў яго на талерачку. Здавалася, такім чынам ён рашуча пераадолеў мяжу няпэўнасьці. Але далей Халад усё рабіў надзвычай далікатна — невялічкай срэбнай лыжкай накладваў ікру так, што, здавалася, баяўся залучыць і адно лішняе зернятка – каб пароўну. Гарушкі атрымаліся маленькімі, але дастатковымі для рассмакаваньня далікатэсу. І мы ўзьнялі келіхі.

– За сяброўства. Але не сьпяшайся, – сказаў Халад. – Вазьмі ў рот колькі зярнятак і пакаўтай іх у глыку віна. Ікра заўсёды павінна мець волю вільгаці...

Гэтая выснова і лёгкае змушэньне ня надта мне спадабаліся, але паслухаўся. Я наогул не люблю гастранамічных вычварэнстваў і ўспрымаю іх, асабліва само гатаваньне, як своеасаблівую цырымонію прыемнага сумоўя.

Вось і смакаваньне найлепшай на Зямлі ежай ікры — ня дужа-ткі мяне ўразіла. Смачна, спажыўна – і ўсяго толькі. Куды больш спадабалася літаратурнае вычварэньне, якое прыйшло ў галаву, калі Халад прапанаваў тост за яшчэ больш шчырыя і даверлівыя адносіны. Я пракаўтаў у віне колькі буйных зярнятаў і падумаў: напэўна, гэта прыдумана дзеля ўтаймаваньня іх жыцьцядайнай сілы, каб з ікры ня вывеліся

ў страўніку імклівыя бялужонкі... Узбрык уяўленьня і ўзрадаваў, але адначасна і прыгнеціў, і я запіў яго доўгімі-доўгімі глыкамі цудоўнага віна.

Халад таксама дапіў сваё і сказаў:

– Ведаеш, Яўкубе, я табе па-добраму зайздрошчу. Ты знаходзіш час займацца творчасьцю, выяўляць сваю душу, а я за бізнэсам сьвету белага ня бачу. Набыткі, прыбыткі, звадкі...

– Жыцьцё такое пайшло... – слаба ўсьцешыў я сябра.

– Жыцьцё, па вялікім рахунку, у многім заўсёды аднолькавае, з пакаленьня ў пакаленьне, – па-філасофску зазначыў ён. – Але хай сабе. Я пра іншае. Кніжку сваю ты абавязкова павінен выдаць! І я хачу ў гэтым прыняць удзел. Але не грашыма. Грошы заўсёды псуюць сяброўства. Вось... – Халад узяў з талерачкі вечка залатой бляшанкі. – Думаю, старонак дзьвесьце ты з яе выціснеш.

Падышоў да рукамыйніка, абмыў жоўты кружок пад струменем і ўклаў яго ў сьвежы цэлафанавы пакецік.

– Вазьмі на добрую справу...

Дзеля прыліку я пачаў аднеквацца, і тады Халад мусова засунуў упакаванае вечка ў кішэню майго пінжака. А каб разьвеяць маю зьбянтэжанасьць, адразу прапанаваў перайсьці ў куток веранды, дзе вокны пачыналіся ледзь не ад падлогі і адкуль разьвіналася больш шырокая панарама мора. Нібыта і не было нічога. Хвалі высока ўзыходзілі густой сінечай, вельмі падобнай на афарбоўку хмараў. Але пошум мора да нас не даходзіў – толькі парывы разьюшанага перад непагаддзю ветру. У зашклёнай шкарлупіне Самуравага затулку было крышку вусьцішна ад яго тужлівага завываньня, але адначасна і ўтульна. Мы сядзелі ў фатэлях і доўжылі сваю гамонку. Пра рознае. Даўняе і сучаснае, сьмешнае і самотнае, легкадумнае і сур'ёзнае. Дзе пагаджаліся, а дзе і пярэчылі адзін аднаму.

Напрыклад, у тым, што гісторыя чалавецтва – гэта безупынная чарада заваёўніцкага паяднаньня і незваротнага драбленьня. Што малыя народы і краіны – вецьце супольнай кашлатай кроны чалавецтва. Засохне адна галінка – паслабее ўсё дрэва. А ўсеземшараўскі камуністычны рай і такая ж усеахопная ліберальна-эканамічная ідэя – усяго толькі макеты своеасаблівых вавілонскіх вежаў, якія нікому ня дадзена ўзвысіць наяве, бо няма на тое вышняй волі.

Я ж ня ўцерпеў зацеміць і сваё балючае:

– А калі будуць зьнікаць у нябыт мовы і народы будуць змушаныя карыстацца якой-небудзь адной, дык спатурыць іх які разумнік збудаваць тую вежу ў галовах. І зьнявечыцца цывілізацыя.

– Гэта мне менш зразумела, – сказаў у адказ задумлівы Халад.

...Я пагасьцяваў у яго цэлыя тры дні, а на чацьвёрты, на завяршэньне нашага сумоўя, па дарозе ў сталічны аэрапорт сябра зарулiў у адно горнае паселішча. Было зразумела, што нас тут чакалі. Адразу ўсадзілі за накрыты пад паветкай стол і пачалі частаваць маладым вінам. А потым – таньчыць і сьпяваць народнае, як перад турыстамі.

І далей па дарозе мы з Халадам раскашаваліся вінцом, якое ўдружылі нам гасьцінныя горцы. А заядалі яго апраснаком з зелянінай, як і не было той дзівоснай ікры.

Разьвіталіся, як і сустрэліся, каля трапа. А перад гэтым, вядома, кульнулі яшчэ па адным гасьцінна-вялізным келіху.

– Наступным разам пакажаш сваю Гюльчытай, ня бойся, не сурочу, – жартаўліва папікнуў я Халада.

– У замежжы цяпер, на менеджэра вучыцца, – вінавата прамовіў ён.

– Тады, спадзяюся, на госьці да мяне, на клёцкі ды мачанку прыедзеце разам.

– Пастараемся.

Калі самалёт набраў вышыню, я прымружыў вейкі і – авохці: раптам адчуў, што цела маё стала ватным, а галава пацяжэла і пашырылася да памераў Зямной кулі. Сон ня браў, але трызьнілася. Здавалася, што самалёт ляціць ня ў небе, а ў маёй галаве і не наўпрост, а робіць пелькі, як упуджаны заяц. Калі крыху ачомаўся ад навалачы, дык узрадаваўся: добра, што папрасіў брата сустрэць у аэрапорце, як тое ведаў.

У горад ехалі моўчкі. Мне не карцела балбатаць, а брат, яшчэ неспрактыкаваны кіроўца, бо зусім нядаўна здаў на правы, пільнаваўся дарогі. Адзінае, чым ён пацікавіўся, дык гэта апетытам Халадавых суайчыньнікаў на бульбу.

– Мандарыны любяць, – ухільна адказаў я прагнаму камерсанту.

Дома, як толькі саставіў у кут валізкі, адразу распрануўся, пакідаў адзеньне на седалы крэслаў і лёг на канапу ды ўкрыўся коўдрай. Але сон зноў ня браў. Яно і добра, бо праз колькі хвілінаў патэлефанавала Кацярына: змаркоцілася, не магу трываць, зараз прыеду...

Абвіты яе пяшчотай, як шчасьцем, я і змарнеў. А прачнуўся толькі апоўначы, калі Каця ўжо сышла – цішком, відаць, не хацела мяне будзіць. “Можа, пакрыўдзілася, мая ясачка”, – падумаў я. Але тут жа суцешыўся: у кватэры было прыбрана, па-халасьцяцку, з каптуром, напоўненая сьметніца вынесеная, адзеньне спарадкаванае ў шафе.

Тады я яшчэ ня ведаў, што абціскаючы на вешале мой пінжак, каханая намацала ў кішэні вечка залатой бляшанкі і выкінула яго ў сьметніцу: падумала, напэўна, што дапіўся ў гасьцях да галюнікаў. А можа, яна і наўмысна абгледзела кішэні, бо так заўсёды рабіла яе маці: мела падставы не давяраць мужу і штораз імкнулася знайсьці цыдулку ад палюбоўніцы ці затайку з палучкі.

Пра Кацярыніна “дабрачынства” я дазнаўся праз тыдзень, калі пачаў весьці перамовы з выдавецтвам. Сэрца маё ледзь не ўчарнела ад прыкрасьці. Калі я ішоў па горадзе, здавалася, што на дне кожнага кантэйнера для сьмецьця ляжыць паасобнік маёй нявыдадзенай кніжкі. Кацярыне пра свае здані я не сказаў і слова: што ўжо вернеш?!

Але і пра магчымы шлюб з ёй і думаць перастаў. І прыгожая, і прыхільная, і працавітая, і адыходлівая ў злосьці, а зірнеш на яе – крыўда міжволі ў зашчапкі бярэ. Дык якое тут жыцьцё! Так дагэтуль і выношу сам сьмецьце з хаты.

### *НяўДАЛЫ ДЭБЮТ*

Бацькі Зьмітрака Скугуты хацелі як найлепш, і пасьля пачатковай школкі выправілі яго далей вучыцца не ў сваю сярэднюю школу, якая месьцілася ў цэнтры калгасу – напрасткі які-небудзь кіламетр, а ў СШ №3, што ў суседнім гарадку Морась. Месца было наогул дзіўным, усё

там пад нумарамі: дамы культуры № 1 і №2, завод радыёэлектронікі №226, які выпускаў не прадукцыю, а “изделия”, харчовая крама №23, ну і гэдак далей. Усе вяскоўцы былі перакананыя: у СШ вучаць лепш, настаўнікі не абцяжараны хатнімі клопатамі, ня думаюць, дзе накасіць сена, як расстарацца дроў, больш увагі вучням удзяляюць. І гавораць спрытна, прыгожа, ня “гагаюць” — ведама ж, гарадскія. Дык і дзецям лацьвей будзе, што ды што ў галовы ўб’юць, глядзіш, і ў інстытуты экзамены паздаюць, вырвуць ногі з калгасных ботаў. Так думалі ня ўсе, але бацькі найбольш здольных вучняў — як зазвычай, у тым ліку і Зьмітраковы.

Пра нязручнасьці для дзяцей яны і ўзгадваць не хацелі: маўляў, нязломкі. А “нязломкам” трэба было ўставаць на дзьве гадзіны раней за “дзеравенскіх”,ісьці пешкі да шашы пяць кіламетраў, у тым ліку і па лесе, сядаць у аўтобус і ўжо даставацца да школы. А скончацца ўрокі – зноў сьпяшайся на прыпынак, інакш давядзецца боўтацца па гарадку да позьняга вечару, пакуль не дачакаешся чарговага рэйсу.

А як узрос Зьмітрок і ў яго грудзіне пачало біцца ўжо наравістае падлеткавае сэрца, дык адчуў, што нязручнасьцей гарадской вучобы стала яшчэ больш. Напрыклад, хацеў займацца баскетболам, дык дзе там – секцыя зьбіралася ўвечары. Бывае, папросіць з сябрукамі-вяскоўцамі хоць на паўгадзінкі адчыніць спортзалу, каб пабегаць з мячыкам – у адказ: толькі ў кедах, падлогу памылі. А кеды ж штодзень ня будзеш з сабой цягаць, дык бегалі басанож, як галадранцы. Ня надта чульлівыя хлопцы не зважалі на гэта, а ў Зьмітракова сэрца запаўзаў халадок адчужанасьці.

Аднойчы ў іх клас прыйшоў адмысловец з заводу і сказаў, што будзе весьці гурток радыёэлектронікі. Зьмітраку вельмі заманулася, і ўжо запісаўся хлопец, але калі дазнаўся, што зноў жа ўвечары заняткі, папрасіў, каб выкрасьлілі.

І з мастацкай самадзейнасьцю так. І з вечарынкамі рознымі, а яму ж ужо падабалася Сьветка Апалонава з паралельнага класу.

Хутка Зьмітрок заўважыў, што моцна зайздросьціць гарадскім і зусім не па-добраму. Асабліва востра адчуваў ён гэта зімой, калі па якой-небудзь пільніцы ўсё ж заставаўся ў школе да апошняга аўтобусу. Вокны ў горадзе займаліся сьвятлом рана, і хлопец, калі ішоў па вуліцы, ня мог адвесьці ад іх вачэй. Асабліва ад тых, што на першым паверсе. Заўсёды ж ёсьць паміж фіранак шчылінка, праз якую карціць падглядзець, што там робіцца, чым займаюцца сямейнікі – можа, вячэраюць ці забаўляюцца з дзіцём... Колькі разоў прахаджваўся нясьмелы Зьмітрок і пад вокнамі ганарыстай Сьвятланы, ды, як бусел, задзіраў угору галаву.

Але гэта даўняе. Бацькоўская надзея ўсё ж спраўдзілася, у інстытут хлопец паступіў, і не на абы-які факультэт, а на матэматычны. Праўда, у вялікім горадзе падлеткавая зайздрасьць пачала шчаміць яго яшчэ больш. Калі Зьмітрок па вечарах хадзіў у шахматны клуб, а ён сур’ёзна захапіўся старажытнай гульнёй, дык зноў жа прагна ўглядаўся ў асьветленыя вокны. І з гэтай прычыны, і, вядома, па вясковай звычцы мераў горад пешкі.

Калі Зьмітрок вучыўся ўжо на трэцім курсе, ён вырашыў ня ехаць на Новы год дадому, а сустрэць сьвята ў інтэрнаце ды падзівіцца, як тут цешацца на сумежжы часу гараджане. Балазе, знайшлася кампанія.

“А што мне дома, адно і тое ж: наліўка з чорнай арабіны, мачанка, віндліна, няспынныя настаўленьні маці, каб стараўся вучыцца, сам сабе прабіваў у жыцьці дарожку, бо валасатай лапы ў нас няма; нязводныя ўспаміны бацькі, як ён служыў у войску; клуб, танцулькі пад сіплы магнітафон ды выхваленьні аднакласьнікаў пра заробкі і амурныя прыгоды. Прыелася!” – суцяшаў сябе хлопец.

У кампанію набралася пяць чалавек: другакурсьнікі Янка з Марыляй, трэцякурсьнікі Юзік з Ядзяй і, вядома, Зьмітрок. Дзяўчаты накроілі салатаў, хлопцы паадкрывалі бляшанкі кансерваў, у тым ліку і з гарбушы, адкаркавалі віно, апроч, зразумела, шампанскага, якое чакала свайго часу. І дачакалася.

Вясёлае і зусім не ваяўнічае “ўра!”, воплескі, пацалункі, суладная гамана... А тады грамадой пайшлі да ёлкі на плошчы і пахадзілі вакол яе карагодам. І разышліся. Зьмітрок застаўся адзін і зразумеў: спадзяваньні на скразную весялосьць ня спраўдзіліся. Дык трохі пашкадаваў, што не паехаў дадому.

Туляўся па інтэрнаце ў пошуках якой-небудзь прыгоды. У закутках-вестыбюльчыках рэдкія насельнікі ладзілі танцы-зацісканцы пад папсовыя касеты, але амаль усе былі ў парах. Зьмітрок прыкмеціў, што і таньчаць чамусьці на цотных паверхах, а на няцотных – толькі рэдкія крокі, кароткія гамонкі ды грукат дзьвярэй.

І раптам на пятым паверсе ён убачыў адзінокую вабную постаць. Дзяўчына абапёрлася рукамі на падваконьне і глядзела ў адхуканую на шкле пратуліну. Зьмітрок падышоў:

– Ты таксама любіш глядзець на асьветленыя вокны?..

– Калі самотна. Квіток на аўтобус загадзя не пасьпела набыць, цяпер маркочуся.

– Я таксама — таўкатня... – схлусіў Зьмітрок. – Давай сумаваць разам, – вырвалася ў яго адчайна-банальнае. – Усё ж весялей...

– Ты думаеш? Ну тады толькі дзяліць напалам, пароўну, а ня складваць...

– З матэматычнага?

– Угадаў. Першакурсьніца.

– Дзіўна. Ня бачыў ніколі...

– Таму што не сумаваў, – усьміхнулася дзяўчына і зірнула на яго.

У яе былі шэрыя вочы, але цёплыя і па-дамашняму звыклыя. Узьлётныя дужкі броваў зьверху падкрэсьлівалі роўны абрэз чубацінкі густых чорных валасоў.

– Напэўна таму...

– А што ўжо цяпер сумаваць... Можа, вып’ем пакрысе, у мяне сьлівовая наліўка ёсьць, дзяўчаты з вёскі прывезьлі...

У Зьмітрака зашчаміла сэрца.

– З радасьцю.

Калі яны ішлі ў пакой, хлопец крадком азіраў Алесю (так звалі дзяўчыну): адзеньне ў абліпачку, выразныя выгіны... І пачаў дзівіцца нязвыклай, сьвяточнай лёгкасьці знаёмства. І прытым без драбніцы вульгарнасьці.

Пакой Алесі быў такі ж, як і яго, апроч кветак, хвальбонак на фіран-

ках ды іншай дзявоцкай акрасы. Чатыры акуратна засланыя ложкі здаваліся неверагодным прасьцягам маладога жаданьня.

– Мы тут пасядзелі крыху з дзяўчатамі, прабач, непрыбрана, – і Алеся пачала завіхацца ля стала. – Прысядзь. Можаш часопісы пагартаць.

– Нешта ня хочацца.

– А я, дарэчы, цябе недзе бачыла...

Зьмітрок трохі зьдзівіўся зусім традыцыйнаму ходу размовы і падумаў, што ён жа павінен быў першым гэта сказаць.

– Цікава...

– У шахматны клуб выпадкам ня ходзіш?

– А чаму я цябе ня бачыў? – зноў зьдзівіўся хлопец, але ўжо больш з праўдзівасьці і нязмушанасьці Алесіных словаў.

– Я таксама захапляюся. Вельмі. Але трэнер сказаў, што ў мяне толькі праразаецца талент.

Дзяўчына паставіла на прыбраны стол пляскатую пляшку наліўкі, дробныя чарачкі і талерку канапак з сырам.

– За Новы год, няхай паспрыяе.

– І абнадзеіць.

Выпілі па чарачцы, і нечакана ўсталявалася гнятлівая паўза, як заззвычай бывае, калі невядома, што рабіць далей. Нітка размовы абарвалася.

– А давай згуляем у шахматы, – раптам прапанавала Алеся.

– Давай, – узбадзёрыўся Зьмітрок.

– Бяры белыя, я люблю адбівацца.

Разгулялі іспанскую партыю. Хлопец імклівай атакай імкнуўся па цэнтру, дзяўчына насуперак рацыі наўмысна расхінала флангі, вабячы яго ў палон і раз-пораз рабіла нечаканыя контрвыпады. Нарэшце Зьмітраку выпала зьвязаць сланом дзьве ладдзі, і ўсё было скончана.

– Вельмі цікавая і нязвыклая партыя, – сказала Алеся. – Я яе абавязкова запомню і нават запішу потым. Давай яшчэ, – яна наліла сабе наліўкі і, не зважаючы на Зьмітрака, разам выпіла, нібы з адчаю.

Другая партыя, усё адно як па маўклівай дамове, пацякла спачатку ход у ход з першай. Здавалася, кожны мкнецца даказаць сваю правату. І пры маўклівай зацятасьці. Але Зьмітрок ужо ўсьвядоміў, што трэба неяк схібіць, змудліць, вядома, неўпрыкмет, каб цяпер абавязкова прайграць ці ў крайнім выпадку зьвесьці ўнічыю, інакш такое шчодрае, сьветлае сумоўе зойдзе ў тупы кут. Ён ужо пачаў шкадаваць, што бязглузда выйграў і першую партыю. А калі выявілася магчымасьць, зноў зьвязаць Алесьчыныя ладдзі, зрабіў зусім нейтральны ход.

Гулялі па-ранейшаму моўчкі. Цяпер ужо Зьмітрок наліў сабе чарачку. “І чаму я так уважліва сачу за дошкай, нібыта баюся прайграць, нібыта аніяк не магу папусьціцца...” – падумаў ён. І нібы сурочыў сам сябе. Калі ўзьняў фігуру каня, якую вырашыў паставіць на не зусім удалую пазіцыю, рука міжволі пахінулася ўлева, і вельмі важная ў абароне чорных пешка была здратавана капытамі. Хоць конь і сам лёг ахвярай, але прадвызначыў нежаданую перамогу. Усё было скончана.

– І дзе ў мяне той талент праразаецца... – прамовіла змаркочаная Алеся. І Зьмітрок прыкмеціў у яе вачах прыкрую адчужанасьць.

– Стамілася я, адпачываць буду. Прабач.

Хлопцу нічога не заставалася, як выказаць спадзяваньне на новую сустрэчу ды зачыніць за сабой дзьверы.

Лежачы ў сьцюдзёным ложку, Зьмітрок думаў: "І чаму калі мужчынскія ды жаночыя істоты так мкнуцца, так ліпнуць адна да адной, душы прыціраюцца скрыпуча-скрыпуча, можна сказаць, амбітна-ўпарта? Можа, таму, што Бог пасьвіць іх не ў чарадзе, а заўсёды паасобку?"

З той пары ён пачаў штотыдзень прыкмячаць у інстытуце вабную Алесю, вітацца, на што яна адказвала заўсёды аднолькава і, як здавалася, іранічна: "Вітаю, гросмайстра!" А на прапановы схадзіць у кіно ці куды яшчэ нязьменна адказвала: "Некалі. Тэорыю вучу".

Якую тэорыю?

А праз паўгоддзе яна і наогул зьехала. Гаварылі, што ўлетку ўдала пераздала ўступныя іспыты ў сталічны універсітэт.

III

Пасьля вучобы Зьміцер пачаў выкладаць матэматыку ў тэхнікуме ў невялікім горадзе. "Уладкавалі" добрыя веды ды рэкамендацыі выкладчыкаў. Маці не магла нарадавацца. А хлопец быў не зусім задаволены. Хутка ён зразумеў, што праўдзівы горад павінен быць усё ж вялікім. Бо інакш і знаёмцы на кожным кроку спатыкаюцца, а яго гарнула да разважлівай адзіноты, і пагалоскі, нібы вераб'і, пералятаюць ад дома да дома, і начальства прыдзірлівае, недэмакратычнае, не раўнуючы як сярдзітыя вясковыя брыгадзіры. Усё пад наглядам!

Адзінае, што ўсьцешвала, дык гэта наяўнасьць даволі вялікага, з вірлівым жыцьцём шахматна-шашачнага клуба. Вядома, Зьміцер, а да таго часу ўжо майстра спорту, стаў самым трывалым яго заўсёднікам. Клуб як рэгіянальны цэнтр сьпяленьня маладых гульцоў прызналі нават у Нацыянальнай федэрацыі. Сюды часта прыязджалі знаныя майстры і ладзілі сеансы адначасовай гульні.

І аднойчы Скугута ўбачыў на дошцы аб'яваў зусім нечаканае спавешчаньне: "Сеанс усьляпую. Гросмайстар Алеся Собіч супраць дзевяці сяброў клуба. Сьпяшайцеся запісвацца. Удзел платны – 10 тысячаў. І па конкурсе. Гульня ў аўторак. Пачатак а 17-й гадзіне".

У Зьмітрака ўзрушылася сэрца: "Няўжо тая самая Алеся?" Але ён ня стаў ні аб чым распытваць кіраўніка клуба Залмана Каца, а толькі пацьвердзіў свой удзел і аддаў "дзясятку".

У вызначаны час заінтрыгаваныя шахматысты сабраліся як адзін. Прыйшлі і слабейшыя, хто не дабіўся права ўдзелу ў незвычайным сеансе. Калі заядлыя аматары расставілі шахматы і падрыхтавалі аркушыкі для запісаў ходаў, Залман увёў у залу высокага вусатага незнаёмца:

– Калі ласка.

– Вітаю вас, сябры. Я Мікіта Собіч. Можна сказаць, прадзюсер, кіроўца аўто, а па сумяшчальніцтве і муж Алесі. Яна сустрэнецца з вамі пасьля сеансу. А цяпер у суседнім пакоі чакае запісаў вашых першых ходаў. І, дарэчы, вам ня трэба быць джэнтльменамі, у крайнім выпадку на сёньняшнім сеансе, – на гэтых словах Мікіта весела гагатнуў, – Алеся выбрала чорныя. Спадзяюся, будзе цікава.

Зьміцер так і абмяк на сваім крэсьле. Усхапіўся толькі калі Залман сеў за столік побач, а Мікіта пачаў абыходзіць гульцоў. Калі чарга падышла

да Зьміцера, ён амаль машынальна вывеў супраць загадзя напісанай адзінкі "е2–е4". Вядома ж, пачалася непазьбежная іспанская партыя. Зьмітрака агарнулі супярэчлівыя пачуцьці. Цяпер ён чамусьці прагнуў толькі выйгрышу. Гэта было справай гонару. І ў той жа час успрымаў напісаны Алесяй на аркушыку чарговы ход як ліст ад каханай. Калі выпадала колькі хвілінаў, круціў аркушык у руках, разглядаў почырк, нібыта імкнуўся знайсьці таямнічы знак у звычайным, па сутнасьці тэхнічным запісе. І аднойчы нават употайкі панюхаў аркушык, каб адчуць пах яе духмянай рукі.

Зьміцер і бянтэжыўся ад юнацкай асьлепленасьці ў гэтых пачуцьцях і дзеях, і трошкі пагардна ўсьміхаўся ў душы з таго, што пасыльным у іх ліставаньні з Алесяй зьяўляецца яе пажыцьцёвы абраньнік, які і знаць ня знае пра іх таямнічы дыялог.

Але гэтыя пачуцьці ня тычыліся самой партыі. Яна цякла па сваіх законах, барацьба завязалася надзвычай вострая. Цяпер у пазіцыі чорных не было такой даверлівай адкрытасьці, як у тую незабыўную навагоднюю ноч. Наадварот, жорсткае супрацьстаяньне ў цэнтры ды заўсёднае імкненьне перахапіць ініцыятыву. Толькі хадоў пасьля пяцідзесяці, а то і больш Зьміцеру ўсё ж удалося адчувальна прарэдзіць шэрагі чорных. А яшчэ хадоў праз пятнаццаць і правесьці імкліва-захапляльную атаку на іх караля. Але менавіта захапляльную. Кароль чорных быў запёрты ў кутку і ня меў ходу – толькі пад шах. Зрадзелыя пешкі таксама ўпёрліся "лбамі" ў саперніцкія. Вольнай заставалася толькі ладдзя. Алеся тут жа скарысталася гэтым і — о, выратавальнае шаленства! — кінула яе пад ногі беламу каралю, прыліпла. Шах! З табою навекі, мой валадар. Шах! — куды ні кроч. А хочаш губі, зьбівай. Але тады няма як хадзіць. Змушаная нічыя.

Захоплены фіналам гульні, Зьміцер і не заўважыў, што аднаклубнікі куды раней закончылі свае партыі. І ўсе прайгралі, у тым ліку і Залман. Яны пачалі падыходзіць да яго і віншаваць. Посьпех! Зьніякавелы Зьміцер падаваў руку неахвотна. Ён наноў расставіў фігуры і па запісах ход за ходам пачаў захоплена аналізаваць партыю. І толькі памножыў сваё расчараваньне: вось і ў гэтым месцы Алеся магла выйграць адным ходам, і ў гэтым...

Сябры клуба пабраліся ў купкі, гаманілі, абмяркоўвалі сеанс, а некаторыя паселі за столікі, каб у які ўжо раз памерацца сіламі. З суседняга пакою вярнуўся Залман і абʼявіў, што, на жаль, Алеся ня зможа сустрэцца з шаноўнай публікай, бо занядужала, вядома ж, колькі сіл паклала. Да таго ж гастралёры сьпяшаюцца ў сталіцу, бо заўтра ім адʼязджаць за мяжу, трэба сабрацца, а ў нас і так забавіліся. Расчараваныя шахматысты трохі папукчэлі, але хутка супакоіліся і ўсе паселі за дошкі.

Калі Зьміцер адыходзіў дамоў, яго запыніў галава клуба і торкнуў у руку невялічкі канверт.

– Вось, гросмайстрыха прасіла перадаць... Гонар маеш!

Лепшы гулец сеанса і ўсхваляваўся, і зьбянтэжыўся... І тады Залман ні то дзеля яго, ні то дзеля свайго супакаеньня сказаў:

– А ведаеш, нічога асаблівага ў ёй няма. Сярэдні клас. Таль вунь на трыццаці чатырох дошках “усьляпую” гуляў. А адзін вугорскі гросмайстра нават на пяцідзесяці чатырох!..

Зьміцер выйшаў на вуліцу і пад сьвятлом першага ж ліхтара ўскрыў канверцік. Там ляжалі дзесяць тысячаў рублёў і маленькі аркушык з выявай кветкі ў куточку (звычайна на такіх запісваюць адрасы ды тэлефоны), а на ім адно слова “Даруй” ды подпіс.

Скугута паклаў канверт у кішэню і закавыляў па ходніку.

Ніколі не адчуваў ён сябе такім незваротна пераможаным.

## *КРЭСЛА*

Толькі людзі, надзеленыя тонкім густам, надаюць значнасьць і такой пабытавай рэчы, як крэсла. І то пачасту ў спалучэньні са сталом — абедзенным, сябрынным ці пісьмовым. З апошнім – найбольш інтэлектуалы, майстры прыгожага пісьменства, для якіх важны нават гатунак паперы, не кажучы ўжо пра асадку.

Астатнім – абы седала.

Паніжаны табурэцік – гэта зэдлік, на ім лацьвей бабам даіць карову ці абіраць бульбу ў сугрэве полымя грубкі: думаць пра сваё і абіраць, мружачы ад млосьці вочы.

Табурэтка, падоўжаная да хоці сябрыннага сумоўя – гэта лава, на чатыры, пяць і болей чалавек. І на адну Станіславу.

Вядома, лепш сядзець уполплеч, радком, бо тады можна прымасьціцца да Яніны і, выпіўшы чарку, незаўважна для ўсіх прыцісну́цца шчыльней, завесьці руку ёй за сьпіну і цісканута за бачок ці нават ніжэй, калі ўжо дагэтуль даваў ёй якія-небудзь знакі. Яніна будзе цярпець, нават ня войкне, бо за сталом жа, людзі наўкруг... Толькі шыкне, нібыта сярдуе, ды таўхане нагой: маўляў, знайшоў час. А потым, перабіваючы твой настрой, наўмысна гучна, каб прыцягнуць увагу грамады, зьвернецца да цябе: “Мікітавіч, давайце я вам морсіку падлію. Вельмі смачны. Ахалоджвае. Журавінкі!” — і возьме ў рукі графін.

Чым даўжэйшая лава, тым, адпаведна, — і маё адступленьне ад тэмы...

З усіх крэслаў найбольш праўдзіва-існае – трон, антыпод сялянскай лавы. Ён ніколі не прыстаўляецца да стала, наогул ні да чаго. На ім не паясі, не папішаш... Ды і паўладарыш хіба што тэатральна, на публіку. Трон рэпрэзентуе сядзеньне, калі можна так сказаць, у чыстым выглядзе. І толькі аднаго чалавека.

“А лава таксама рэпрэзентуе сядзеньне аднаго чалавека – Станіславы!” – папракне мяне за недакладнасьць высноваў які-небудзь уедлівы педант.

Ня трэба блытаць: Станіслава, ад якой ужо моташна, — з песьні, а той

ці іншы пасаджэнец на трон – з аналаў гісторыі: вось імя, вось гады валадараньня.

Праўда, калі ўжо зусім строга праводзіць антыподнае падзяленьне лавы і трону, дык варта зрабіць і агаворку. Аднойчы ў жыцьці лава падалася мне найлепшым у сьвеце тронам – калі на ёй прыснула мая мама.

Лава стаяла ў нас на покуце. Мама прыйшла з калгаснай працы палуднаваць. Хуценька парабіла ўсё па гаспадарцы і прылегла перахапіць колькі хвілінаў. На мулкай дошцы зручна – доўга не пасьпіш.

Але вернемся да трону звычайнага. Вось яно, крэсла, на якім сядзяць стагоддзямі, кажучы фігуральна, а калі казаць папраўдзе, дык вельмі мала – хіба што на дзяржаўных прыёмах...

Пасядзець на троне мае магчымасьць толькі жменька людзей: валадары, іх малыя дзеці, асабліва сыны (а як не дазволіш пестункам падурэць) ды блазны і лёкаі. Апошнія, вядома, употай. Прыйдзе каторы прыбіраць у троннай зале, змахвае гусіным крылом пыл з “крэселка”, а потым азірнецца па баках ды гоп! на седала. І вочы ўгору закоціць ад асалоды ў сваім халопскім нахабстве. Дурань!

Чым больш старое, спадчыннае крэсла, тым больш надзейным грамадзянінам і прадказальным чалавекам зьяўляецца яго ўладальнік.

Самае простае і хутка зробленае крэсла – сьвежы пень. Яго, як і трон, таксама нельга падсунуць. Калі патрэбны стол — пілуй дрэва побач. Калі камін – разводзь каля яго цяпельца.

Крэслы-пні каля чаратовых буданоў ды вогнішчаў найбольш прыдатныя для напісаньня тэзісаў рэвалюцыйных закалотаў.

Троны добра выкарыстоўваць для падпісаньня маніфестаў пра волю. Але гэта бывае вельмі рэдка. І зазвычай пад змусам.

Чалавек, якому ўсё адно на чым сядзець – рэвалюцыянер. Якому не – кансерватар. Якому толькі на гэтым і больш ні на чым – або спадчынны спадкаемец улады, або дыктатар, дужа залежны ад наркотыку валадарства.

Тэхналагічная эра дала новае азначэньне крэсла: машына для сядзеньня. Традыцыі замянілі адкрыцьцямі эрганомікі.

У вас горбік? Націсьнеце вось гэтую прысьцібку — і сьпінка ад’едзе назад. Вы карузьлік? Вось на гэтую, калі ласка, — крэсла панізіцца амаль да падлогі. А тады можаце ўзвысіцца, тым больш на такой пасадзе!

Я ня ведаю ці можна лічыць прагрэсам зьмяншэньне ў крэсьле ножак з чатырох да адной ды яго кручэньне вакол гэтай восі. Чалавек пачаў нагадваць жука, якога пасадзіў на іголку хцівы калекцыянер-спакусьлівец. Найлепш гэтаназіраць у барах, дзе ножкі-іголкі ў крэслах асабліва высокія. Пі ў меру, жук, і не круціся!

Вельмі цяжка ўявіць “аднаногі” трон. Хіба што ў маральна аслабленай імперыі.

Тым больш недапушчальна, каб трон узьнімаўся альбо апускаўся. Бо ён заўсёды навырост. Сьпінка павінна быць замацавана жорстка. І зробленая не ў адпаведнасьці з выгінамі валадарскага цела, а, наадварот,

валадар мусіць выструньвацца па зададзенай вертыкалі. Сёньня рабочае месца манарха, бадай, адзінае, якое не прадугледжвае эрганамічных зручнасьцей. Іншая справа, што і месца гэтага не прадугледжваюць сучасныя тэхналогіі заснаваньня ўлады.

Што датычыць лавы, дык тут тэхнічны прагрэс амаль немагчымы, бо адразу адбываецца немінучая яе транфармацыя ў ложак або канапу.

Немагчыма ўявіць лаву на адной ножцы. Сялянскае, як і валадарскае, не паддаецца вышчамленьню ў моднае.

“Машынернае” (на той час) крэсла я ўбачыў у дзяцінстве. Бацька прынёс аднекуль нямецкае, трафейнае. Аснова металічная, складная, седала і сьпінка – з несашчыльненых адмысловых дашчурак. Дызайн даволі вытанчаны. Трохі нагадвае шэзлонг. У грузавік такіх сашчыльніш процьму. Ехалі ж, як на прагулянку: паганяць са стрэльбамі тубыльцаў, параскашавацца на яйках ды млеку...

Я любіў складваць і раскладваць той “шэзлонг”, майстраваць на ім шпакоўню ці яшчэ што. Не разьлічваў з няўмельства рухаў — і на дашчурках седала засталося колькі прыкметных запілаў. Нібы засечкі хлапчукоўскага росту на вушаку.

Калі зьехаў на вучобу, бацькі чамусьці вынеслі трафей у курнік, і яго пераможна заседжвалі куры. Можа, у знак помсты за сваіх вясковых папярэдніц, з-пад якіх жарлівыя акупанты выграбалі яйкі.

Праз колькі дзесяцігоддзяў я і знайшоў у курніку сімвал нашай Перамогі над агрэсіўна-зьністажальным вар’яцтвам. І забраў у горад. Адчысьціў, адмыў іржу і замяніў адну падгнілую дашчурку. Але ня тую, дзе засталіся мае запілы. Пафарбаваў.

І цяпер раблю своеасаблівы перфоманс: паступова раскладваю крэсла – гэта наш шлях да Перамогі, саджуся на яго і згадваю свайго бацьку-ваяра. Пачуваю сябе, як на троне.

## *СПРАўДЖАНАя ПАМЫЛКА*

Час ад часу міжволі задумваешся: адкуль жа яно пайшло, прыгожае пісьменства? Слова ж было ў Бога і самім Богам. І раптам выявілася ў чалавечым штукарстве ды яшчэ шматкроць памножылася бясконцымі раздрукоўкамі. Скрозь смугу часу бачыў засяроджанага чарняца ў кельлі, які нясьпешна, слова за словам выводзіць на аркушы Сьвятое Пісаньне. І раптам ён задумваецца пра сваё, чалавечае, зьбіваецца з тропу і ўчыняе памылку.

Дык гэта ўжо не бездакорнае, не Сьвятое Пісаньне, а тэкст, з непрыемнай акрасай чалавечай недасканаласьці. І за гэта чарнец трываў кару. Атрымліваў якое-небудзь нялюбае паслушэнства, напрыклад, вычышчаў гной са стойлаў манастырскай худобы. І думаў, як пазбавіцца сваёй прыкрай няпэўнасьці. А потым, занураны ў собскія думкі, зьдзіўляўся яшчэ больш, калі пасьля ўседлівай доўгай працы, перачытваючы перапісанае, са зьдзіўленьнем заўважаў, што зьнявечыў памылкамі ўжо не адно Божае слова, а два, тры, чатыры, і зноў ніякавеў перад сваёй слабасьцю. А потым

неўпрыкмет для сябе вывеў з гэтых памылак слова, зрабіўшы чарговы крок наўзбоч.

І нічога не заставалася, як аблудна сагравацц сябе верай у тое, што сваё слова – атожылак слова Божага, што яно пераемнае і вартаснае. І гэтае слова з цягам часу пусьцілі на ўцеху і фанабэрліва назвалі прыгожым пісьменствам. І вось скрозь стагоддзі віхурыцца яно на павевах чалавечай жарсьці, аблуды і славалюбства.

Наўрад ці дакучаўся такімі думкамі пераканаўчы ў прыгожым пісьменстве Леў Талстой. Праўда, ускосна сваім битаваньнем ён пацьвярджаў жыцьцяіснасьць акрэсьленай тэмы. Нібы чарнец, які даў хібу пры перапісваньні, ён сам браў на сябе якое-небудзь паслушэнства – ці то вёў шырокі пракос па пожні, ці ішоў за віхлявым плугам, у кашулі па-сялянску падперазанай вузкай дзягай. І пераказваў Сьвятое пісаньне дзеткам, і адсякаў айцу Сергію, чытай сабе, палец, каб няхай нават і крывёю, ды заліць, зьнішчыць пякучы прысак жарсьці.

Але ж з другога боку цьвердзілася і натура, патураная бязмежнасьцю ўсьвядомленага майстэрства ды пыхай самалюбства. І Леў зноў і зноў перапісваў свае рукапісы ў аблудным памкненьні дасягнуць пераканаўчасьці непаўторнага Узору. Доўжыў і доўжыў сказы, бо яму здавалася: яшчэ адно слова – і пад рукой зажывіцца рэчаісты сьвет і можна будзе пачаць адлік сваіх дзён тварэньня. У пачатку якога – таксама слова.

А тут яшчэ людзі паверылі яму, як Збавіцелю. Дык і не ўтрываў Леў, зрабіў рашучы крок у бездань разьняволенасьці – адцураўся сваёй царквы, каб ніколі больш не абцяжарваць сябе нават нязмушаным, нават выпадковым сумневам і дакорам. І ў гэтай сьмелай сіле выявілася самая вялікая чалавечая слабасьць. Але адчуў яе магутны Леў толькі напрыканцы жыцьця, толькі ў звужаным затулку старэчай нямогласьці.

У прадчуваньні катастрофы цела ён памкнуўся выратаваць сваю душу, сеў у цягнік і паехаў у Опціну пустынь, каб, як нашкодзіўшы хлапчук, папрасіць прабачэньня ў сьвятых айцоў. Каб, як зблудны сын, вярнуцца пад высокі дах свайго спадчыннага духоўнага прыпірышча. І не адолеў вялікі шлях праз засені вышэйшай волі, а толькі выканаў апошняе паслушэнства, назва якому – сьмерць.

*«Дзеяслоўцы» віншуюць свайго даўняга сябра і сталага аўтара часопісу Сяргея Рублеўскага са слаўным юбілеем, зычаць плёну і маладога запалу на доўгія гады і спадзяюцца яшчэ ня раз убачыць ягоныя творы на старонках часопісу.*